# УСТУПНЫЯ ІСПЫТЫ РЭФАРМУЮЦЬ?

## Каб не «біць па хвастах»

— Несумненна, для сістэмы адукацыі ідэалагічная і выхаваўчая работа з'яўляецца адным з найважнейшых кірункаў дзейнасці, — падкрэслівае Ігар Карпенка. — Але нам трэба шукаць новыя падыходы, укараняць новыя формы і метады работы з навучэнскай і студэнцкай моладдзю. Гэта ненармальна, калі непаўналетнія здзяйсняюць злачынствы. Нягледзячы на тое, што летась колькасць такіх выпадкаў зменшылася на 18% у параўнанні з 2016 годам, часта мы не ведаем прычын, якія прывялі да здзяйснення правапарушэнняў і злачынстваў, «б'ём па хвастах». І тут прасочваецца відавочная недапрацоўка сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы установы адукацыі. Асабліва гэта тычыцца такіх службаў у ВНУ. Праца толькі па запыце кліента — гэта анахранізм, які павінен быць выкаранены з практыкі работы педагогаў-псіхолагаў і сацыяльных педагогаў. Працаваць трэба ў першую чаргу на апярэджанне. Тут вельмі важныя дыягностыка і сістэмны аналіз праблем, на аснове якіх выбудоўваецца ўся выхаваўчая і ідэалагічная работа.

Галоўная задача сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі — не столькі падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання, колькі комплекснае і сацыяльнае развіццё вучня, якое дазваляе яму быць паспяховым у жыцці і канкурэнтаздольным у сучасным свеце. Вельмі важна дапамагчы кожнаму выпускніку ажыццявіць прафесійнае самавызначэнне, забяспечыць яго сацыяльную і прафесійную мабільнасць.



Кнігу, у якой карцінка сінхранізуецца са смартфонам, прадэманстравала віцэ-прэм'еру Васілю ЖАРКО і міністру адукацыі Ігару КАРПЕНКУ дырэктар выдавецтва «Пачатковая школа» Вольга ВАНІНА. Тэхналогія дапоўненай рэальнасці будзе выкарыстоўвацца пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў і іншых выданняў.

## Праграмы новага пакалення

Сёння ў краіне працягваецца распрацоўка і паэтапнае ўвядзенне па ўсіх вучэбных прадметах абноўленых навучальных праграм, у якіх улічаны міжпрадметныя сувязі і практыкаарыентаванасць адукацыйнага працэсу (у 2016/2017 навучальным годзе па абноўленых праграмах навучаюцца ўжо вучні першых, другіх, пятых, шостых, дзясятых і адзінаццатых класаў). Пасля масавай апрабацыі навучальных праграм цягам навучальнага года па прапанovах настаўнікаў-практыкаў у іх уносяцца змяненні і дапаўненні.

**«Задача адна — кожны выпускнік павінен мець першае працоўнае месца».**

На нацыянальным адукацыйным партале (www.adu.by) арганізавана работа адкрытай інтэрнэт-пляцоўкі, дзе прадстаўлены новыя навучальныя праграмы. Усе зацікаўленыя маюць магчымасць звярнуцца на партал са сваімі пытаннямі, прапановамі і заўвагамі.

У 2016 годзе было выдадзена 46 навучальных дапаможнікаў, 14 з іх — падручнікі новага пакалення: яркія, напісаны прастой, даступнай моваю, з сучаснай электроннай версіяй. Да распрацоўкі кожнага падручніка прыцягваюцца настаўнікі-практыкі.

Падручнік ствараецца разам з комплексам вучэбна-метадычных матэрыялаў да яго — фактычна гэта цэласны вучэбна-метадычны комплекс, які ўключае ў сябе акрамя падручніка вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўніка, пры неабходнасці рабочы сшытак ці іншы дапаможнік для навучэнцаў. «Работа па ўдасканаленні навучальных праграм, стварэнні сучасных падручнікаў будзе весціся і далей у актыўным рэжыме, шляхам пошуку новых цікавых рашэнняў», — паабяцаў міністр.

Ігар Карпенка канстатаваў, што шэраг пытанняў у сістэме агульнай сярэдняй адукацыі патрабуе далейшага вырашэння. Напрыклад, удасканальваць нацыянальную сістэму ацэнкі якасці агульнай сярэдняй адукацыі плануецца шляхам увядзення так званых міністэрскіх кантрольных работ. Шмат пытанняў і да гімназічных устаноў. Усе пагаджаюцца: патрабаванні да дзейнасці гімназій трэба павышаць: і праз забеспячэнне конкурсу пры паступленні ў гэтыя ўстановы, і праз устанаўленне абгрунтаваных кантрольных лічбаў прыёму. Яшчэ адно пытанне — наколькі рацыянальна фарміравалася сетка гімназій і сярэдніх школ? І што рабіць дзецям, якія не прайшлі па конкурсе ў пяты гімназічны клас, а ў навакольлі сярэдніх школ увогуле не засталося? Да таго ж менавіта этап здачы экзаменаў у гімназію застаецца зонай самай высокай карупцыйнай рызыкі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Элемент сацыяльнай абароны

У 2016 годзе для рэальнага сектара эканомікі і сацыяльнай сферы установамі прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі падрыхтавана больш чым 147 тысяч спецыялістаў.

— Звяртаю ўвагу, што прадастаўленне першага працоўнага месца маладым спецыялістам ва ўмовах высокай канкурэнцыі на рынку працы з'яўляецца дадатковым элементам сацыяльнай абароны выпускніка і не супярэчыць прынцыпам Балонскага працэсу пры падрыхтоўцы спецыялістаў у рамках дзяржаўнага заказу, — падкрэслівае Ігар Карпенка. — Больш за тое, дадатковыя сацыяльныя гарантыі, якія дае статус маладога спецыяліста, павінны распаўсюджвацца, на наш погляд, і на выпускнікоў платнай формы навучання, накіраваных на работу, што прадугледжваецца ў новым праекце Кодэкса аб адукацыі.

Для даведкі: летась пажадалі размеркавацца практычна ўсе выпускнікі медыцынскіх універсітэтаў, якія навучаліся на платнай аснове. А ў ВНУ Міністэрства адукацыі колькасць студэнтаў-платнікаў, якія звярнуліся з просьбай іх размеркаваць, складае толькі 2%. Сёлета, можна не сумнявацца, значна больш студэнтаў платнай формы навучання будуць прэтэндаваць на гарантаванае працаўладкаванне, тым больш што на рынку працы сутыкнуцца выпускнікі, якія навучаліся і па пяцігадовай, і па чатырохгадовай праграме вышэйшай школы.

Намеснік прэм'ер-міністра Васіль Жарко, які прыняў удзел у калегіі, папярэдзіў: «Задача адна — кожны выпускнік павінен мець першае працоўнае месца. Каб пазбегнуць праблем з размеркаваннем выпускнікоў, кіраўнікам устаноў адукацыі трэба ўжо сёння напоўніцу задзейнічаць многія фактары: актывізаваць працу камісій па размеркаванні, шукаць рэзервовыя варыянты для працаўладкавання, стварыць ва ўстанове базы вакансій, каб кожны выпускнік мог бачыць, дзе ён можа сябе рэалізаваць. Вельмі важнае пытанне — прагназаванне патрэбы ў кадрах. На жаль, мы вымушаны канстатаваць наяўнасць фактаў суб'ектывізму пры вызначэнні кантрольных лічбаў прыёму, у тым ліку на платную форму навучання. Планаванне прыёму павінна быць у цеснай сувязі з вынікамі размеркавання і патрэбамі рынку працы. А ў нас пры зніжэнні кадравай патрэбы галін на працягу шэрагу гадоў значна памяншэння лічбаў прыёму не адбываецца...»

Створана міжведамасная рабочая група з удзелам прадстаўнікоў Мінэканомікі, Мінадукацыі, перад якой пастаўлена задача павысіць эфектыўнасць прагназавання кадравай патрэбы і аператыўнага планавання. Разам з тым у пытаннях фарміравання заказу, працаўладкавання выпускнікоў і фарміравання зместу адукацыі неабходна павысіць адказнасць заказчыкаў кадраў: пачынаючы ад кіраўніка канкрэтнай арганізацыі, якая заключае дагавор з установай адукацыі, і заканчваючы аблвыканкамамі і міністэрствамі...

## Філіялы ВНУ: час адмаўляцца?

Міністр адукацыі нагадаў, што ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы распачалася работа па ўдасканаленні сістэмы цэнтралізаванага тэсціравання і механізма правядзення ўступнай кампаніі ў цэлым. Галоўнае ў гэтым пытанні — захаваўшы плюсы і пазітыўны вопыт дзеючай схемы (напрыклад, у частцы мінімізацыі карупцыйных рызык), не ўпусціць з віду прафесійную матывацыю і ацэнку асобасных здольнасцяў абітурыента. «Мяркую, што такія прапановы павінны выпрацоўвацца з прыцягненнем экспертнай супольнасці савета рэктараў і савета дырэктараў устаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, і чакаю ад іх ініцыятыўных прапаноў», — падкрэсліў кіраўнік ведамства.

У сістэме прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі прыярытэтнымі задачамі з'яўляюцца ўдасканаленне зместу і аптымізацыя тэрмінаў падрыхтоўкі. На ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі тэрміны ўжо скарочаны ў сярэднім на паўгода без шкоды вытворчаму навучанню ў 79 установах адукацыі па 74 спецыяльнасцях. Таксама праведзена адпаведная работа па мінімізацыі і дыферэнцыяцыі тэрмінаў атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Па 22 спецыяльнасцях са 170 устаноўлены мінімальна дапушчальныя тэрміны, па 54 — яны вар'іруюцца ў залежнасці ад складанасці спецыяльнасці.

У вышэйшай школе Міністэрства адукацыі прапануе скарачэнне тэрмінаў падрыхтоўкі да 4—4,5 года яшчэ па 56 спецыяльнасцях і з 4,5 года да 4 гадоў па 42 спецыяльнасцях.

— Неабходна ліквідаваць дубліраванне падрыхтоўкі кадраў на ўзроўнях сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, — лічыць міністр.— Да таго ж трэба забяспечыць развіццё магістратуры як самастойнай ступені вышэйшай адукацыі з больш выразным вызначэннем мадэлі выпускніка і яго месца на рынку працы. Ёсць магчымасці і для аптымізацыі як саміх устаноў, так і формаў арганізацыі навучання. Прыйшоў час адмовіцца ад філіялаў устаноў вышэйшай адукацыі, тым больш што ў шэрагу выпадкаў навучальны працэс арганізуецца там пераважна за кошт выкладчыкаў, якія туды камандзіруюцца, а падрыхтоўка ідзе па тых жа спецыяльнасцях, што і ў рэгіянальных ВНУ. Лічу, што завочная форма навучання не павінна дамінаваць над дзённай, як гэта назіраецца ў асобных установах адукацыі (пераважна прыватнай формы ўласнасці).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Класныя навіны

# РЭАЛЬНАЯ МАТЭМАТЫКА ДЛЯ ЖЫЦЦЁВЫХ СІТУАЦЫЙ

**Якім павінен быць ідэальны падручнік і чаму так мала сярод педагогаў ахвотных стаць класнымі кіраўнікамі? Свaімі думкамі на гэты конт падзяліліся ўдзельнікі выніковай калегіі Міністэрства адукацыі...**

— Мяне яшчэ ў пачатку педагагічнай дзейнасці хвалявалі наступныя пытанні: ці ўсіх дзяцей можна навучыць матэматыцы, бо ў іх розныя здольнасці і тэмп навучання? І чаму так часта здараецца, што ў пачатковай школе дзіця добра паспявае па матэматыцы, яго ставяць у прыклад, а ў сярэдніх класах — і якасць навучання, і цікавасць да прадмета знікае? — кажа **настаўнік матэматыкі сярэдняй школы №20 горада Оршы, настаўнік-метадыст Валерый ГЕРАСІМАЎ.** — Сучасныя дзеці адрозніваюцца ад тых, каго мы вучылі нават дзесяць гадоў таму. Яны сталі менш чытаць, але дзякуючы мабільным прыладам і інтэрнэту магчымасцей для атрымання разнастайнай інфармацыі ў іх значна пашырыліся. Варта адзначыць і тое, што ў сённяшніх школьнікаў часта проста не хапае часу, каб паспець зрабіць усё ў сваім школьным і пазашкольным жыцці.

На думку вопытнага педагога, пры стварэнні сучаснага падручніка патрабуецца адбор мінімальна неабходнага, але дастатковага для якаснага засваення зместу адукацыі навучальнага матэрыялу плюс дыферэнцыраваны падыход да навучання праз прыцягненне дадатковага матэрыялу, у тым ліку электронных адукацыйных рэсурсаў.

Ён падкрэслівае: «Абстрактная цікаўнасць да «царыцы навук» саступае месца «рэальнай матэматыцы». Таму адбор і прад'яўленне навучальнага матэрыялу павінны адпавядаць яшчэ і кампетэнтнаснаму падыходу, што ў многім супадае з жыццёвай ідэалогіяй падлеткаў — навучанне для жыцця і праз рашэнне жыццёвых праблем. У гэтым сэнсе матэматыка ператвараецца і ў сродак далучэння да інфармацыйных тэхналогій».

Тыя ж тэкставыя задачы па матэматыцы — выдатная мадэль для вырашэння жыццёвых сітуацый. Яны спрыяюць развіццю ў вучняў мыслення, фарміраванню кампетэнцый і сацыялізацыі школьнікаў.

У бягучым навучальным годзе на базе 22 школ распачалася рэалізацыя інавацыйнага праекта, у рамках якога плануецца распрацаваць вучэбна-метадычныя комплексы для першых—чацвёртых класаў, якія адпавядаюць патрабаванням сённяшняга часу. Вучэбна-метадычны комплекс для першага класа ўжо распрацаваны і выдадзены.

**Начальнік упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Сяргей ПАРОШЫН** падзяліўся сваім бачаннем ролі класнага кіраўніка ў выхаваўчым працэсе: «Гэта злучальнае звяно паміж настаўнікамі-прадметнікамі і бацькамі. Ён павінен быць і добрым арганізатарам, і псіхолагам, і сацыяльным педагогам, і проста цікавым чалавекам, да якога цягнуцца дзеці. На жаль, не кожны настаўнік хацеў бы стаць класным кіраўніком, хоць яркіх і цікавых педагогаў у галіне вельмі шмат. Чаму? Прычыны хаваюцца не толькі ў шматгранным спектры іх дзейнасці, нізкай аплаце за гэту працу (у сярэднім 34 рублі ў месяц), але і ў тым, што ніхто не вучыць таму, як быць добрым класным кіраўніком: ні ў ВНУ, ні пасля яе заканчэння.

У Гомельскай вобласці спрабуюць ліквідаваць гэты прабел за кошт павышэння якасці працы раённых метадычных аб'яднанняў класных кіраўнікоў, павышэння кваліфікацыі ў інстытуце развіцця адукацыі, правядзення абласных конкурсаў «Мой клас — мая каманда», «Наш класны — самы класны» і іншых. Думаю, што менавіта падрыхтоўцы класных кіраўнікоў неабходна ўдзяліць больш увагі і на рэспубліканскім узроўні, — падкрэслівае Сяргей Парошын. — Сёння ў школе аднаму псіхолагу з усімі негатыўнымі праявамі не справіцца, таму кожны класны кіраўнік павінен стаць тым чалавекам, якому дзіця верыць і можа падзяліцца з ім патаемным».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
**ОАО «Стройтрест №1»**

27 марта 2017 г. в 14.30 состоится очередное общее собрание акционеров **ОАО «Стройтрест №1» по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 15**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и основные направления деятельности Общества на 2017 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета Общества в 2016 году. Оценка деятельности генерального директора Общества наблюдательным советом.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2016 год. О выплате дивидендов за 2017 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2017 год и первый квартал 2018 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2017 году.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в очередном общем собрании акционеров, – 21 марта 2017 года.

С информацией о деятельности Общества за 2016 год и основных направлениях деятельности на 2017 год можно ознакомиться в рабочие дни с 07.03.2017 по 27.03.2017 с 9.00 до 18.00 с перерывом с 13.00 до 14.00 по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Платонова, 15; в день проведения собрания – по месту его проведения.

С иными материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочие дни с 21 по 27 марта 2017 г. с 9.00 до 18.00 с перерывом с 13.00 до 14.00 по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Платонова, 15; в день проведения собрания – по месту его проведения с 9.00 до 13.00.

Регистрация участников собрания с 13.30 до 14.00. Для регистрации при себе иметь: акционеру Общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.

**Начало работы собрания в 14.30.** УНП 100288960